**11 кастрычніка 2024 г. - 100 гадоў з дня нараджэння Паўла Рыгоравіча Каранчука (1924-2012), ветэрана сельскагаспадарчай вытворчасці, краязнаўца, Ганаровага грамадзяніна Кобрынскага раёна**



Павел Рыгоравіч Каранчук нарадзіўся 11 кастрычніка 1924 года ў вёсцы Магдалін Кобрынскага павета Палескага ваяводства (цяпер Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці) у сям'і сялян. Усё сваё жыццё яго бацькі працавалі на зямлі. Бацьку, Георгія Карнілавіча Каранчука, лічылі ў вёсцы пісьменным чалавекам, бо ён скончыў царкоўна-прыходскую школу ў Расіі (у гады Першай сусветнай вайны сям'я Каранчукоў была ў бежанцах), і вельмі хацеў, каб сын атрымаў добрую адукацыю. У дакументах аб нараджэнні Паўла сельскі пісар зрабіў памылку – запісаў Рыгоравічам, а не Георгіевічам.

У 1936 годзе Павел Каранчук скончыў чатыры класа Барысаўскай пачатковай школы. Бацька адправіў яго вучыцца ў пяты клас Кобрынскай польскай школы (зараз СШ № 2 г. Кобрына), дзе той закончыў 7 класаў. З прыходам Савецкай улады ў 1939 годзе працягнуў вучобу ў рускамоўнай школе. У 1941 годзе ўступіў у камсамол. Па заканчэнні школы ў Кобрыне атрымаў у сельскім Савеце накіраванне на вучобу ў школу фабрычна-завадскога навучання г. Магілёва. Аднак вучыцца не прыйшлося: памёр бацька, а праз два тыдні пачалася Вялікая Айчынная вайна.

Родная вёска стала зонай акупацыі, а каб выжыць, юнаку прыходзілася рабіць любую працу, у тым ліку, капаць ямы для магіл растраляных яўрэеў. Павел аказаўся ў спісах для адпраўкі на прымусовыя работы ў Германію, аднак здолеў уцячы са зборнага пункта. Тым часам фронт Чырвонай Арміі набліжаўся, у зоне акупацыі з'явілася ваенная разведка. Кемлівы юнак змог паказаць на ваеннай тапаграфічнай карце аб'екты фашыстаў.

У першыя дні пасля вызвалення родных мясцін ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Павел Каранчук разам з іншымі аднавяскоўцамі прыйшоў у ваенкамат, каб прызвалі ў армію. Але іх накіравалі на аднаўленне разбураных вайной шлюзаў Дняпроўска-Бугскага (Каралеўскага) канала. Адсюль

Павел Каранчук трапіў у школу малодшых камандзіраў у Пінск, дзе рыхтавалі кадры для аховы шлюзаў, стаў намеснікам камандзіра ўзвода па палітчастцы.

Вярнуўшыся ў вёску, стварыў камсамольскую арганізацыю, у якую ўваходзілі сем чалавек. З 1947 года па 1948 год ён сакратар камсамольскай арганізацыі Кіселявецкага сельсавета. Завочна вучыўся ў Пружанскім сельскагаспадарчым тэхнікуме, які скончыў з адзнакай.

1949 год адкрыў новы этап у лёсе Паўла Каранчука: яго прынялі ў партыю. У гэтым жа годзе ў Кобрынскім раёне пачалі стварацца калгасы, і ў 24 гады Павел Каранчук стаў першым старшынёй калгаса «Новы шлях», які нязменна ўзначальваў на працягу 36 гадоў. Пад яго кіраўніцтвам калгас хутка стаў адным з паказальных на Брэстчыне. Калгас «Новы шлях» Кобрынскага раёна быў у ліку тых гаспадарак, на базе якіх праводзіліся рэспубліканскія семінары па сельскай гаспадарцы, сюды прыязджалі абменьвацца вопытам кіраўнікі гаспадарак з усёй Беларусі. Першы сакратар ЦК КПБ Пётр Міронавіч Машэраў неаднаразова бываў у гэтай гаспадарцы. Дарэчы, пры яго садзейнічанні ў калгасе быў пабудаваны кармазавод.

Шмат добрых спраў за сваю кіраўніцкую дзейнасць паспеў зрабіць старшыня калгаса П. Р. Каранчук. Была пабудавана пачатковая школа ў в. Магдалін і сярэдняя школа ў в. Кісялёўцы, правялі газ. Мясцовыя жыхары дагэтуль з павагай завуць Паўла Рыгоравіча няйначай, як першы старшыня. Ён шмат зрабіў для развіцця калектыўнай сельскагаспадарчай працы на Кобрыншчыне.

У 1984 годзе Павел Рыгоравіч выйшаў на пенсію, але таксама не сядзеў без справы, займаўся краязнаўчай работай. У 1985 годзе захапіўся тапанімікай – навукай пра паходжанне геаграфічных назваў, скалесіў амаль усе вёскі Кобрынскага раёна і здолеў знайсці тлумачэнне назваў вельмі многіх з іх. У раённай газеце «Кобрынскі веснік» апублікаваны шэраг артыкулаў пад рубрыкай «Деревенька моя…». Пісаў ўспаміны пра сябе, якія цесна перапляталіся з гісторыяй яго роду, вёскі, утварэння і станаўлення роднага калгаса. Прымаў актыўны ўдзел у зборы матэрыялаў, падрыхтоўцы і выданні гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць. Кобрынскі раён» (2002).

Невычэрпная працавітасць і аўтарытэт набылі яму павагу сярод людзей. З 1987 года па 1988 год П. Р. Каранчук працаваў старшынёй раённага Савета ветэранаў, з 1997 года па 2001 год - старастам в. Магдалін. Неаднаразова выбіраўся дэпутатам Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў, чатыры разы - дэпутатам Кобрынскага раённага Савета народных дэпутатаў, шмат разоў - дэпутатам Кіселявецкага сельскага Савета народных дэпутатаў.

Яркі і плённы працоўны шлях П. Р. Каранчука адзначаны дзяржаўнымі ўзнагародамі: ордэнамі Леніна, «Знак Пашаны», медалём « За доблестный труд. В ознаменование 100-летия со дня рождения Владимира Ильича Ленина» (1970), Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР (1974). За вялікі асабісты ўклад у развіццё сельскагаспадарчай галіны раёна, вывучэнне, захаванне і прапаганду гісторыка-культурнай спадчыны Кобрыншчыны рашэннем Кобрынскага раённага выканкама ад 18 жніўня 2005 года № 786 Паўлу Рыгоравічу Каранчуку прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна».

Павел Рыгоравіч Каранчук памёр 9 красавіка 2012 года. Яго жыццё і дзейнасць увайшлі ў гісторыю Кобрыншчыны як яркі прыклад самаадданай працы, адданага служэння людзям, вернасці грамадзянскаму абавязку і Радзіме. У яго лёсе, як у люстэрку, адбілася цэлая гістарычная эпоха.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2019 г., дапоўнены ў 2024 г.
Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф I катэгорыі
аддзела абслугоўвання і інфармацыі

## Працы П. Р. Каранчука

**Коренчук, П**. Деревенька моя… : [Литвинки, Батче, Шиповичи, Огородники, Мельники, Пески-I, Пески-II, Мазичи, Полятичи, Гуцки, Андроново, Фруктовый: тапаніміка] / Павел Коренчук // Кобрынскі веснік. – 2000. – 8 ліпеня (№ 54).

**Коренчук, П.** Деревенька моя… : [Хидры, Изобелин, Островляны, Забужки, Корчицы, Мазури, Патрики, Ляхчицы, Новосадки, Петьки, Овады, Гайковка, Каташи, Перки, Пески, Яголки, Ушковица, Суховчицы: тапаніміка] / Павел Коренчук // Кобрынскі веснік. – 2000. – 12 ліпеня (№ 55).

**Коренчук, П.** Деревенька моя… [Рудец Малый, Рудец Большой, Октябрь**,** Кустовичи, Воротыничи, Подземенье, Бородичи, Грушево, Худлин, Мефедовичи, Повить, Онисковичи, Выгода, Стародубцы, Совпли, Дубины, Доброе, Мелинково: тапаніміка] / Павел Коренчук // Кобрынскі веснік. – 2000. – 2 жніўня.

**Коренчук, П. Р.** Деревенька моя...: [Новосёлки, Залесье, Девятки, Рынки, Тевли, Глинянки, Стригово, Стрижево, Литвинки, Литвиново, Мерница, Заужовье, Стасюки, Клещи, Батче: тапаніміка] / Павел Коренчук // Кобрынскі веснік. - 2000. - 9 жніўня. - С. 3.

**Коренчук, П. Р.** Деревенька моя... : [Шляхта, Остромичи, Ерёмичи, Жуховцы, Осовцы, Запруды, Подберье, Лука, Борки, Иловск, Шеметовка, Берёзно, Мазури, Смолярня, Плянта, Темра: тапаніміка] / Павел Коренчук // Кобрынскі веснік. - 2000. - 16 жніўня. - С. 3.

**Коренчук, П. Р.** Деревенька моя... : [Дивин, Корчицы, Ор, Клетыще, Борисовка, Оса, Верхолесье, Ольховка, Забава, Бельск, Ходыничи: тапаніміка] / Павел Коренчук // Кобрынскі веснік. - 2000. - 19 жніўня.- С. 2.

**Коренчук, П. Р.** Деревенька моя...: [Босяч, Буховичи, Лепесы, Легаты, Дубовое, Лесково, Подолесье, Козище, Берёза, Залесье. Девятки, Селец, Закросница, Турная, Прилуки, Быстрица, Муховлоки, Колубели: тапаніміка] / Павел Коренчук // Кобрынскі веснік. - 2000. - 26 жніўня. - С. 2.

**Коренчук, П. Р.** Деревенька моя…: [Калюхи, Гирск, Болота, Заколнечье, Рыбна, Киселёвцы, Магдалин, Борисово, Брилёво: тапаніміка] / Павел Коренчук // Кобрынскі веснік. - 2000. - 30 жніўня. - С. 2.

**Коренчук, П.** Мясной цех колхоза : [«Новый путь» Кобринского района] / П. Коренчук // Заря. - 1971. - 18 июля.

**Коренчук, П**. Бригадные советы / П. Коренчук // Заря. - 1968. - 23 ноября.

В колхозе «Новый путь» Кобринского района.

**Коренчук, П.** Специализация – выгодное дело : [] / П. Коренчук, П. Доломанюк // Заря. - 1963. - 9 января.

О развитии животноводства в колхозе «Новый путь» Кобринского района.

## Аб жыцці і дзейнасці П. Р. Каранчука

**Ардэнаносцы**. Каранчук Павел Рыгоравіч // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 427. – (Вызначыліся працай).

**Долготович, Б. Д.** Коренчук Павел Григорьевич / Б. Д. Долготович // Почетные граждане белорусских городов / Б. Д. Долготович. - Минск, 2008. – С. 30-31.

**Павел Григорьевич Коренчук** // Они награждены орденом Ленина : альбом. - Кобрин, 1981.

**Каранчук Павел Рыгоравіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук. – 2-е выд., дап. – Кобрын, 2020. – С. 41-44 : фат. – (Серыя «Імёны на карце Кобрыншчыны»).

**Каранчук Павел Рыгоравіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 20-21 : фат.

**100 гадоў** з дня нараджэння П. Р. Каранчука (1924) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 122-123.

**Ганарымся** земляком. Павел Рыгоравіч Каранчук // Каб не абарвалася нітка памяці… : нарыс аб краязнаўцах Кобрыншчыны / УК «Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка», аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. – Кобрын, 2009. – С. 34-38.

**Курачук, С.** История кобринского края в лицах [Почётный гражданин Кобринского района. П. Г. Коренчук, В. И. Сухарев] / страницу подготовила Светлана Курачук // Кобрин-информ. – 2021. – 24 июня (№ 25). – С. 4. – Продолжение. Начало в № 12 от 25 марта 2021 г. ; № 17 от 29 апреля 2021 г. ; № 21 от 27 мая 2021 г.

**Муха, Ф.** По новому пути / Федор Муха ; фото Александра Шульгача // Заря. – 2020. – 13 июня (№ 48). – С. 17.

Под руководством П. Г. Коренчука колхоз «Новый путь» быстро стал одним из показательных на Брестчине.

**Курачук, С.** Достойным - почётное звание! / Светлана Курачук // Кобрин-информ. – 2018. – 6 декабря (№ 49). – С. 4.

Продолжением проекта Кобринской центральной районной библиотеки «Славутыя імёны маёй малой радзімы» стало издание биобиблиографического справочника «Імі ганарыцца Кобрыншчына» и создание полнотекстовой базы данных «Ганаровыя грамадзяне Кобрынскага краю».

**Коренчук Павел Григорьевич** : [некролог] // Кобрынскі веснік. – 2012. - 14 красавіка. – С. 12.

9 апреля ушел из жизни Почётный гражданин Кобринского района П. Г. Коренчук.

**Пянко, А**. Возвращение к истокам / Алексей Пянко // Кобрынскі веснік. - 2010. - 16 кастрычніка. - С. 4.

**Сацук, А.** Рождённый октябрём / Алексей Сацук // Кобрынскі веснік. - 2010. - 6 лістапада. - С. 2.

Трудовая деятельность П. Г. Коренчука – это целая историческая эпоха в биографии нашей страны.

**Шевченко, А**. Судьба председателя / Алла Шевченко // Кобрин-информ. – 2007. - 3 мая. – С. 3.

Павел Григорьевич Коренчук - Почетный гражданин Кобринского района, кавалер ордена Ленина и «Знак Почета».

**Коренчук, П.** «Не все умеют командовать…А руководить - это, знаете ли, искусство» / Павел Коренчук ; [беседовала] Валерия Корыстина // Кобрынскі веснік. – 2005. – 17 снежня. – С. 3.

Интервью с Почетным гражданином Кобринского района Павлом Григорьевичем Коренчуком.

**Почётные** граждане Кобринского района // Кобрынскі веснік. – 2005. – 24 жніўня.

О присвоении звание «Почётный гражданин Кобринского района» Коренчуку Павлу Григорьевичу, Сухареву Владимиру Ивановичу.

**Петров, П.** Из одного металла льют медаль за бой, медаль за труд / Петр Петров // Заря. - 2004. – 24 февраля.

Богата Кобринщина на людей, ставших ее гордостью и славой, в их числе и Павел Григорьевич Коренчук.

**[Каранчук П. Р.]** // Кобрынскі веснік. – 1999. – 17 сакавіка.

**Коренчук Павел Григорьевич** // Список почетных граждан города Кобрина, Кобринского района / отдел идеологической работы Кобринского исполкома. – Кобрин, 2002. – С. 3.

**О присвоении** звания «Почетный гражданин Кобринского района» **Коренчуку Павлу Григорьевичу** : решение Кобринского районного испонительного комитета, 18.08.2005 г., № 786 // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф. 4. Оп. 6. Д. 820. Л. 192.

**О награждении** Почетной грамотой и Грамотой Верховного Совета Белорусской ССР работников сельского хозяйства республики **Коренчука Павла Григорьевича** : Указ Президиума Верховного Совета Белорусской ССР // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф. 4. Оп. 1. Д. 1103. Л. 4.

**О награждении** орденами и медалями СССР передовиков животноводства Белорусской ССР : выписка из Указа Президиума Верховного Совета СССР // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф. 4. Оп.Т. Д. 419. Лл. 38, 39, 41.

**О награждении** юбилейной медалью «За доблестный труд. В ознаменование 100-летия со дня рождения Владимира Ильича Ленина» **Коренчука Павла Григорьевича** : постановление Брестского обкома КПБ, исполкома Брестского областного Совета депутатов трудящихся, президиума областного Совета профсоюзов, 27 марта 1970 г., № 58-а // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф. 4. Оп. 1. Д. 594. Лл. 1, 8, 9, 54, 55, 78, 80, 88.

**Кобрынскі раён**

**Колгас «Новы шлях» Кобрынскага раёна**

**Каранчук Павел Рыгоравіч**

**Калгасы**

**Старшыні**

**Краязнаўцы**

**Ганаровыя грамадзяне**